ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 27 (3483) ● ● ЧАЦВЕР, 21 ЛІПЕНЯ , 2016

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Такі загадкавы сусвет**

Творы трох беларускіх мастакоў дэманструюцца ў арт-галерэі эстонскага замка Schloss Fall Стар. 2



**...А цяпер святкуе ўвесь горад**

"Беларускае Купалле" ў Даўгаўпілсе ўжо мае свае традыцыі Стар. 3



**Свята з далёкай даўніны**

Актывісты Беларускай грамады Малдовы адзначалі Купалле ўжо ў трэці раз Стар. 4

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# Дагда песням рада

## Другі Фэст беларускай песні ды танца, які ладзіўся ў латвійскім горадзе, сабраў творчыя гурты і салістаў з розных краін

**Іван Ждановіч**



Спявачка Зінаіда Сіліня




По вуліцах латышскага горада ідуць удзельнікі беларускага "Дагда-Фэсту"

Запрашэнне на "Фэст" — такая назва ў міжнароднага творчага праекта — мы атрымалі ад кіраўніцы Беларускай суполкі "Вербіца" з Дагды Таццяны Гогалінскай. Ведаем: леташні досвед падахвоціў яе прадоўжыць цікавую справу. Дарэчы, тэкст пра падзею ў нашай газеце меў назву "Цёплыя словы за добрае свята". Тады Зофія Іоніна, член таварыства "Вербіца", расказала, як прайшоў першы фэст, была там і фраза: "Цёплыя словы гучалі і ў адрас Таццяны Гогалінскай — яна ж і падала ідэю фэсту, і вельмі шмат зрабіла, каб ён адбыўся".

І вось у нашай элпошце — спасылка ад Таццяны на фотаздымкі з "Фэсту", які прайшоў 9 ліпеня. Як вядома, дагдзінскі фэст, які й сёлета ладзіўся "на адлёт" Купальскае пары, па-ранейшаму зберагае ў сабе матывы чароўнага народнага свята. Тое бачна і на здымках (дзяўчаты ў вяночках з яркіх кветак), і песні ў Дагдзе гучаць адпаведныя. На сайце Пасольства Беларусі ў Латвіі знаходзім інфармацыю пра "Дагда-Фэст" (адметная, запамінальная ў яго назва!) як свята беларускага фальклору, у якім паўдзельнічалі творчыя гурты нацыянальна-культурных таварыстваў з Латвіі, Польшчы, Літвы і Беларусі. "Мерапрыемства было арганізавана Беларускім таварыствам "Вербіца" пры садзеянні Дагдскай краёвай думы і Генеральнага консульства Беларусі ў Даўгаўпілсе, — чытаем далей. — У ходзе "Дагда-Фэсту" яго ўдзельнікі прадставілі шырокую праграму з беларускіх народных і сучасных песень, танцаў, вершаў".

Варта патлумачыць, што Дагда — гэта горад (з 1992 года) на паўднёвым ўсходзе Латвіі, у Латгаліі: паблізу мяжы з Беларуссю. У Дагду ехаць ад Краславы — кіламетраў 40. А з 2009 года горад — адміністрацыйны цэнтр Дагдскага краю. Спадзяемся, з часам у якасці каштоўнага складніка "Дагда-Фэсту" будзе крэатыўна скарыстана і прыгожае тамтэйшае возера Дагда.

У розных СМІ Латвіі змешчаны тэксты, фотаздымкі пра "Дагда-Фэст". Мяркуючы па тым, як выглядала шэсце — са сцягамі, назвамі гуртоў — удзельнікаў было нямала. Сярод іх гурты "Аколіца" (Дагда, мастацкі кіраўнік Тамара Старавойтава), "Надзея" (Рыга, мастацкі кіраўнік Людміла Серада), "Злата" (Елгава, мастацкі кіраўнік Зэнта Траццяк) "Спадчына" (Даўгаўпілс, мастацкі кіраўнік Яніна Юзэфовіч), "Сузор'е" (Вісагінас, мастацкі кіраўнік Ірына Урбанавічэне), Тэатр песні "Субацея" (Навапалацк, мастацкі кіраўнік Кацярына Фёдарава), "Нараўчане" (Нараўка, Польшча, мастацкі кіраўнік Пётр Скепка). Выступалі таксама салісты Зоя Садоўнікава, Людміла Сінкевіч, Зінаіда Сіліня. На фэсце гучалі беларускія народныя і аўтарскія песні, у тым ліку кампазітараў Станіслава Клімава, Альберта Белуся, Мікалая Яцкова на вершы беларускага паэта з Даўгаўпілса Станіслава Валодзькі.

→ Стар. 2

ВЕСТКІ

## Тут сустракаюцца стагоддзі

**Іван Іванаў**

**Новаму будынку Нацыянальнай бібліятэкі — 10 гадоў**

Што будынак вельмі арыгінальны, гаворыць хаця б такі факт: ён займае 24 месца ў спісе 50 самых незвычайных будынкаў у свеце. Гэты цуд, празваны "алмазам ведаў", абавязкова паказваюць турыстам пад час экскурсій па Мінску. Важна і тое, што ў бібліятэцы сабраны каштоўныя кніжныя скарбы, там зручна працаваць. Між тым Нацыянальная бібліятэка ўжо — гэта і месца для шэрагу знакавых, у тым ліку і міжнародных сустрэч. Як гаварыў у дзень адкрыцця Нацыянальнай бібліятэкі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, беларусы "пачыналі будаваць бібліятэку, а ўзвялі найбуйнейшы інфармацыйны сацыякультурны цэнтр".

Цяпер супрацоўнікі бібліятэкі асвоілі велізарны патэнцыял установы, закладзены праекціроўшчыкамі з улікам досведу падобных устаноў у розных краінах. І вось ужо ўнікальны культурны комплекс з поўным правам можна лічыць важнаю часткай інтэлектуальных скарбніцаў свету.

Бібліятэку наведваюць і дыстанцыйна: праз партал НББ у інтэрнэце. Увогуле ў ёй 18 чытальных залаў з абсталяванымі працоўнымі месцамі. А ў фондах — каля 9,6 мільёна адзінак захоўвання: ад рукапісных і старадрукаваных кніг да электронных выданняў. У збудаванні ёсць і галерэі, выставачныя пляцоўкі — на іх ладзяцца творчыя праекты. За 10 гадоў у НББ прайшло каля 2000 кніжных выстаў, больш за 200 мастацкіх праектаў.

ЗДАРОЎЕ

# Не позна злавіць свае лета

**Рыгор Арэшка**

**Беларускія санаторыі становяцца ўсё больш папулярнымі сярод замежных гасцей**



Новы санаторый "Пліса" адкрыўся ў Глыбоцкім раёне

Сёння, калі ў свеце неспакойна, асаблівую каштоўнасць набываюць месцы, дзе можна падмацаваць здароўе без лішніх стрэсаў. І рознымі шляхамі добрая пагалоска пра беларускія здраўніцы ідзе далёка за межы краіны. Лічбы ж кажуць самі за сябе. Так, з пачатку года ў беларускіх санаторыях пабывала больш за 95 тысяч замежных гасцей, большасць з іх — расіяне. Пра тое паведаміў журналістам на нядаўняй прэс-канферэнцыі дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні ды санаторна-курортным лячэнні Генадзь Балбатоўскі.

З кожным годам у беларускіх санаторыях, што размешчаны у прымежных рэгіёнах, павялічваецца і колькасць адпачывальнікаў з Германіі ды Польшчы. Як адзначае спецыяліст, гэта дазволіла санаторыям Гродзеншчыны павялічыць экспарт паслуг у тры разы. Па словах чыноўніка, у айчынныя здраўніцы замежнікаў прыцягвае перш за ўсё высокі ўзровень медыцынскага абслугоўвання.

Безумоўна, такая інфармацыя цікавая і для беларусаў замежжа, якія збіраюцца наведаць Бацькаўшчыну. Бо, як вядома, у санаторы вам не трэба будзе клапаціцца ні пра дах над галавою, ні пра харчаванне. Як правіла, у іх ёсць адпрацаваныя шляхі зносін з абласнымі, раённымі цэнтрамі. А сярод найбольш запатрабаваных і паспяховых Генадзь Балбатоўскі назваў санаторыі "Ружанскі", "Прыдняпроўскі", "Юнацтва", "Лясное", "Баравое". Ён адзначыў і санаторый "Альфа Радон" (Дзятлаўскі раён Гродзеншчыны), які можа прэтэндаваць на вышэйшую катэгорыю. А нядаўна, 8 ліпеня, новы санаторый "Пліса" адкрыўся ў Глыбоцкім раёне.

Падрабязныя звесткі пра беларускія санаторыі, кошты іх паслуг можна знайсці ў інтэрнэце. Здраўніцы, запэўніў журналістаў Генадзь Балбатоўскі, пастаянна клапоцяцца аб паляпшэнні ды ўдасканаленні матэрыяльнай базы. На гэта ідуць значныя сумы грошай ад рэалізацыі пуцёвак. Пры тым уласнікі санаторыяў звяртаюць увагу і на ўзровень сэрвісу і харчавання, навучаюць работнікаў сакрэтам гасціннасці, ствараюць сістэмы заахвочвання.

Якія, аднак, кошты ў беларускіх санаторыях? Значна ніжэйшыя, заўважым, чым у гатэлях, напрыклад, Турцыі. Генадзь Балбатоўскі агучыў такія лічбы: на пачатку сезона дзень пражывання і лячэння ў санаторыі ў сярэднім каштаваў 46,3 рубля ў суткі, у разгар сезону — 48,5 рубля. Нагадаем: амерыканскі долар цяпер — гэта два "новыя", пасля дэнамінацыі-2016, беларускія рублі. У міжсезонне ў санаторыях ёсць салідныя зніжкі: ад 15 да 20 працэнтаў. Так што, запэўніў кіраўнік цэнтра, кожны аб'ект знаходзіць свайго спажыўца.

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# Дагда песням рада

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Як вядома, беларусы — людзі адкрытыя, міралюбныя, гатовыя культурнымі скарбамі падзяліцца з тымі, для каго яны цікавыя. І здорава, што арганізатары далучылі да свята і мясцовыя вакальныя ды танцавальныя гурты "Akmiņeica" (мастацкі кіраўнік Вольга Бабавіча), "Olūteņi" (мастацкі кіраўнік Інта Валюма), "Dagda" (мастацкі кіраўнік Рыта Вайшля), "Balzāms dvēselei" (мастацкі кіраўнік Айна Скаромка). Яшчэ знакавы момант: праявіла інтарэс да імпрэзы Генеральнае консульства Беларусі ў Даўгаўпілсе. Удзельнікаў фэсту, гледачоў вітаў консул Дзмітры Канстанцінаў. Ён падзякаваў усім, хто спрычыніўся да арганізацыі "Дагда-Фэсту", ацаніў яго як каштоўны ўнёсак у развіццё беларускай культуры, звычаяў і традыцый. Па словах консула, "Дагда-Фэст" вельмі спрые і творчым кантактам паміж беларускімі суполкамі ў замежжы, і ўмацаванню сяброўскіх стасункаў паміж прыгранічнымі рэгіёнамі. Добрыясловыказалітаксаманачальніца аддзела адукацыі і культуры Дагдскай краёвай думы Марыя Міцкевіч, старшыня суполкі "Вербіца" Таццяна Гогалінская, член Кансультатыўнага камітэта прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый Латвіі, старшыня Беларускага таварыства "Прамень" у Рызе Алёна Лазарава і намесніца старшыні Беларускага таварыства "Уздым" з Даўгаўпілса Вольга Паўловіч.

Праграма "Дагда-Фэсту", калі меркаваць па фотаздымках, складалася з шэрагу канцэртаў па горадзе, потым было заключнае мерапрыемства ў гарадскім парку. Безумоўна, вялікую ўвагу дагдзінцаў і гасцей горада прыцягвалі святочныя, вельмі яркія, з беларускім каларытам касцюмы ўдзельнікаў. Фэст, што цікава і арыгінальна, адкрываўся канцэртам ля Дагдскага ландсцінга: так, пэўна, называецца ў горадзе мясцовы адміністрацыйна-тэрытарыяльны орган улады. Потым рознакаляровае шэсце рушыла (ішлі пешшу!) да месца наступнага выступлення: у Цэнтр аховы здароўя і сацыяльных паслуг "Дагда". На здымках бачна: некаторыя з гледачоў — у інвалідных калясках. А ў другой палове дня свята перамясцілася ў гарадскі парк.



З Наваполацка на "Дагда-Фэст" прыехалі артысты Тэатра песні "Субацея"

Спадзяемся, з цягам часу "Дагда-Фэст" узбагаціцца і выставамі твораў беларускіх мастакоў, і прыгожымі вырабамі ды майстар-класамі народных майстроў, інфафотастэндамі пра жывыя традыцыі беларускага Купалля ды жыццё ў сучаснай Беларусі. Магчыма, да месца будуць і выставы кніг, часопісаў, фотаздымкаў, якія сведчаць пра даўнія культурныя сувязі Латгаліі, яе культурных дзеячаў з Беларуссю, ды і пра сучаснае жыццё беларусаў у Латвіі. Бо фэст, як вядома, гэта заўсёды нешта большае, чым проста канцэрты. Дарэчы, арганізатары ж могуць на будучыню прапанаваць і гасцям, творчым гуртам, едучы на фэст, прывозіць з сабою, напрыклад, мабільныя стэнды з цікавай інфармацыяй пра тое, хто і адкуль у Дагду завітаў.

Між тым Саюз беларусаў Латвіі, падаецца нам, можа арганізаваць у Дагдзе да наступнага фэсту і выставу газеты "Прамень". Да таго ж СБЛ мае цікавы досвед стварэння мабільных інфастэндаў, ці плакатаў-трансформераў (пра тое гл: "Душэўны летапіс жыцця", ГР, 2016, №8, 3 сакавіка), і на "Дагда-Фэсце" яго можна было б крэатыўна выкарыстаць. Як пісала газета, "на любым мерапрыемстве, выставе, фэсце аповед пра суполку будзе выглядаць салідна, прыгожа, сучасна. А пры жаданні плакат можна скласці ў буклет (зручна перавозіць!), зрабіць новыя копіі, ці ўнесці змены, паднавіць плакат, ці пераслаць сябрам па электроннай пошце..." З прыгожымі афішамі па горадзе, з рознымі ілюстрацыйна-візуальнымі, выставачнымі "фішкамі", падаецца нам, фестывальная прастора горада напоўніцца новымі рысамі, гукамі, фарбамі. А ў выніку і ўражанні ў гледачоў пра Беларусь і беларусаў будуць больш яркімі, багатымі.

МІЖКУЛЬТУРНЫ ДЫЯЛОГ

# Такі загадкавы сусвет

**Творы трох беларускіх мастакоў дэманструюцца ў арт-галерэі эстонскага замка Schloss Fall**

Мастацтва, як вядома, вельмі добры дыпламат. "2016-ы — Год культуры ў Беларусі, калі значная ўвага надаецца мерапрыемствам у сферы мастацкай культуры, захавання гістарычна-культурнай спадчыны, развіцця народных традыцый, падтрымкі творчых ініцыятыў," — такімі словамі адкрываў выставу "Ментальны сусвет. Прысвячэнне Шагалу" Пасол Беларусі ў Эстоніі Анатоль Сцёпусь. Вернісаж быў 3 чэрвеня ў замку Schloss Fall у Кейла-Йоа, выстава зладжана з нагоды 20-годдзя SED ARTE Gallery пры падтрымцы Пасольства Беларусі ў Эстоніі. У галерэі прадстаўлены работы членаў Саюза мастакоў Беларусі Аляксандра Грышкевіча (пейзажы), Ілоны Касабука (яна і член міжнароднага аб'яднання мастакоў у Парыжы) і Уладзіміра Канцадайлава (станковы жывапіс, графіка).


Ніна Пээрна (злева) і яе выхаванкі сустракаюць гасцей

У Эстоніі працы аўтараў выстаўлены ўпершыню. Аляксандр, казаў, першы раз у краіне, яму тут усё вельмі спадабалася: "Тутэйшыя краявіды вельмі падобныя да беларускіх. Вось толькі мора ў Беларусі няма...". Ілона з Уладзімірам былі ў Таліне ў 1986 годзе: на практыцы пасля першага курса інстытута. Мастачка заўважыла: "Пасля таго, на жаль, больш не прыязджала. І гэта вельмі добрыя пачуцці, калі зноў наведваеш тыя месцы, дзе калісьці быў шчаслівы". Пра сябе Уладзімір распавёў, што яму цікава працаваць у розных жанрах, ён піша розныя карціны: пейзажы, абстракцыі. Робіць калажы.

На адкрыццё выставы ў замак Бенкендорфа-Валконскіх прыйшло шмат гасцей, сярод іх Пасол Беларусі ў Эстоніі Анатоль Сцёпусь і дарадца беларускай амбасады Святлана Карпушына, Пасол Грузіі ў Эстоніі Тэа Ахвледзіяні, дырэктар Цэнтра рускай культуры Юрый Палякоў, прадстаўнікі Міністэрства культуры Эстоніі, эстонскага фонду інтэграцыі ды міграцыі "Нашы людзі", творчай інтэлігенцыі, мясцовых СМІ, дзеячы культуры Эстоніі. А вось да сустрэчы гасцей спрычыніліся і беларусы Эстоніі. Дакладней, сустракалі іх гаспадыня галерэі SED ARTE Вольга Любаскіна і спявачкі з ансамбля "Дзяўчаты" Беларускага цэнтра вучобы і развіцця EVA-Studiorum — у прыгожых беларускіх нацыянальных касцюмах. Так што адмысловая беларуская атмасфера панавала ў замку ад пачатку імпрэзы. На адкрыцці вернісажу гучала песня "Купалінка": ёй "Дзяўчаты" віталі гасцей. А другую заспявалі па-эстонску.

Нам было вельмі прыемна ўсведамляць, што і спеўнае мастацтва прыйшлося да месца, калі адкрывалася цудоўная выстава беларускіх мастакоў у Эстоніі. Радуемся, што культурныя сувязі паміж краінамі, народамі развіваюцца. Увогуле варта сказаць: эстонцы з цікавасцю наведваюць выставы, знаёмяцца з творчасцю таленавітых беларусаў. Маюць інтарэс і да таго, што робяць тэатры, як развіваецца народная творчасць, кінематограф, літаратура ў розных краінах. Так што, спадзяемся, будуць і новыя беларуска-эстонскія культурныя праекты. І мы да іх гатовы далучацца.

**Ніна Пээрна,**
старшыня Беларускага цэнтра вучобы і развіцця EVA-Studiorum, Эстонія

СУСЕДЗІ

## На гандлёвых шляхах — ажыўленне

**Прадукцыя беларускіх вытворцаў выклікала цікавасць на Міжнароднай выставе "АГРА-2016" у Кіеве**

Не сакрэт: гандлёвыя шляхі аб'ядноўваюць народы. Як слушна заўважыў пісьменнік і прававед Шарль Луі Мантэск'ё, дзякуючы гандлю ўсе народы даведаліся пра норавы іншых народаў і змаглі параўнаць іх, што мела пазітыўныя наступствы. Меркаванне аўтара філасофскага рамана "Персідскія лісты" і цяпер актуальнае. Бо нават разглядаючы тавары з замежжа мы нешта даведаемся пра культуру, традыцыі вытворцаў. На буйных выставах яны знаёмяць наведнікаў з новымі таварамі, распрацоўкамі, раскажуць і па сваю краіну. Так было і на XXVIII Міжнароднай аграпрамысловай выставе "АГРА-2016", якая праходзіла на тэрыторыі Нацыянальнага комплексу "Экспацэнтр Украіны".

Беларусь была прадстаўлена ў Кіеве вядомымі вытворцамі: брэнды МАЗ, МТЗ, Магілёўскі завод "Электрарухавік", Гомельскі хімічны завод, Мінскі маторны завод і Барысаўскі завод "Металіст" папулярныя ў суседзяў. Напрыклад, быў на выставе аўтакран на шасі МАЗа грузападымальнасцю 60 тон, а яшчэ магутны цягач, пасажырскі аўтобус МАЗ-241. Адбылася "прэм'ера" самазвала МАЗ-6516М9: гэта ўжо чацвёрты МАЗ экаўзроўню Euro-6, ён мае новы дызайн, мерседэсаўскі рухавік. Як тлумачыў прадстаўнік завода Віталь Чарняўскі, гэта першы чатырохвоснік у СНД ў стандарце Euro-6, у навінкі прывабныя суадносіны цаны, якасці ды сэрвісу. І самі наведнікі гаварылі: МАЗ — гэта клас! Ва Украіну, як вядома, пад час фінальнай часткі Еўра-2012 па футболе было пастаўлена 185 беларускіх аўтобусаў. На вуліцах Кіева ды іншых гарадоў сустрэнеш і самазвалы МАЗ: гэты мега-брэнд упэўнена рухаецца на ўкраінскі рынак. "У сегменце грузавых аўтамабіляў наша прадукцыя займае каля 27 адсоткаў украінскага рынку, — запэўніў Віталь Чарняўскі. — За паказчыкам — вялікая праца і мазаўцаў, і партнёраў ва Украіне".

Людна пры стэндах Мінскага трактарнага завода. Цяпер, дарэчы, зборка шэрагу мадэляў трактароў маркі МТЗ наладжана і ва Украіне. У планах — пашырэнне мадэльнага іх шэрагу, на чарзе таксама і зборка беларускіх збожжаўборачных камбайнаў. Добрых партнёраў ва Украіне мае і магілёўскі "Электрарухавік". Сяргей Худалій, дырэктар гандлёвага дома прадпрыемства, удакладніў: каля 10 гадоў прадукцыя рэалізуецца ва Украіне: "Ёсць і шмат падробак, нізкаякасных, пад рухавікі беларускай вытворчасці. Мы з тым змагаемся і робім усё, каб трымаць на вышыні беларускую марку, бо магілёўскія рухавікі — высокай якасці".

У цэлым жа сумесная праца беларускіх вытворцаў ды іх украінскіх партнёраў дае добры плён: за першы квартал года агульны таваразварот паміж Беларуссю і Украінай склаў амаль 750 мільёнаў долараў і павялічыўся ў параўнанні з тым жа перыядам 2015 года на на 2,5 працэнта.

**Мікалай Бойка,** г. Кіеў

СВОЙ ШЛЯХ

# ...А цяпер святкуе ўвесь горад



Выступае музыка-віртуоз

## "Беларускае Купалле" ў Даўгаўпілсе ўжо мае свае традыцыі

Яркае, маляўнічае тэатралізаванае дзейства праходзіла 9 ліпеня, у суботу вечарам, у парку Дубровіна. Свята ладзілі даўгаўпілскі Цэнтр беларускай культуры пры падтрымцы Упраўлення культуры і Цэнтра латышскай культуры. Кіраўніца ЦБК Жанна Раманоўская нагадала: Купалле ў Даўгаўпілсе праводзілася штогод, але раней было камерным, скіраваным на беларускую дыяспару. Бо менавіта ў гэтую пару адзначае дзень нараджэння суполка "Уздым". Але два гады таму даўгаўпілсцы зладзілі Купальскі канцэрт у Літве, летась — у даўгаўпілскім Палацы культуры. І вось сёлета зрабілі вялікае свята "Беларускае Купалле" для ўсіх ахвочых. Вулічныя вячэрнія канцэрты ў выхадны дзень — навінка сезону ў горадзе, якая абяцае стаць традыцыяй.

Выхадны быў дзень, выдатнае было надвор'е… У парку ля імправізаванай сцэны шмат дабразычлівых і актыўных гледачоў: не проста сядзелі ды слухалі, але й звівалі вянкі, пісалі запіскі ды пакідалі на "Дрэве жаданняў", пілі гарбату на Купальскіх травах з мёдам, падпявалі, танцавалі. Наша Купальская пляцоўка маляўніча аформлена ў стылі народных традыцый. Былі вогнішча, кола на шасце, упрыгожанае вянкамі-стужкамі, плот-тын, драўляныя сталы і лаўкі, старадаўнія прылады побыту і, вядома ж, шмат палявых кветак, траў і калосся. Сцэнар свята ўмела і прадумана склала кіраўніца Тэатральнай студыі "Паўлінка" Інэса Казлоўская: двухгадзінны канцэрт прайшоў на адным дыханні, а гледачам заставалася толькі ўздыхаць, што так хутка праляцеў час.



Яркія колеры Купальскага свята ў Даўгаўпілсе

Пранікнуцца духам Купалля дапамаглі гурты ЦБК. "Купалінка" спявала і Купальскія песні, яшчэ абыграла знакамітую "Касіў Ясь канюшыну". Танцавальны гурт "Лянок" (стылізаваныя касцюмы, вяночкі ў дзяўчат) выканаў прыгожыя народныя танцы, і гледачы пайшлі ў карагоды. А ВІА "Пралескі", салісты гурта Аляксандр Лапа і Павел Прозар зачаравалі ўсіх лірычнымі песнямі. Натхнёна верш "Купалле" чытала Тэрэса Паўлава. А яшчэ ж былі госці з Беларусі! У стылі этна спявала трыа з горада Мёры. У стыльных этнакасцюмах, басаног, тры дзяўчыны-прыгажуні пакарылі гледачоў спевам і танцамі. Яны, дарэчы, не ўпершыню выступаюць у Даўгаўпілсе. Потым зайгралі-заспявалі "Траецкія музыкі": з горада Барысава, з Міншчыны. І ўжо ніхто не змог усядзець на месцы. Аматарскі гурт уразіў усіх: высокае майстэрства, а які настрой! Ды яшчэ жарты-прымаўкі кіраўніцы Святланы Вашкевіч. Музыка Сяргей віртуозна граў на дудцы, жалейцы, свісцульцы і нават акарыне.

Пра нашае Купальскае свята расказалі мясцовыя СМІ, нават канал АНТ з Мінска. Цэнтр беларускай культуры выказвае ўдзячнасць за дапамогу ў арганізацыі, правядзенні свята ўпраўленню культуры, Цэнтру латышскай культуры, муніцыпальнаму прадпрыемству "Labiekārtošana-D", паліцыі самакіравання, прэс-службе Даўгаўпілскай гардумы, упраўленню камунальнай гаспадаркі, а таксама Дэпартаменту спорту і моладзі — за валанцёраў: шмат дапамаглі ў правядзенні майстар-класа па пляценні вянкоў. Дзякуй усім, хто нас падтрымаў! Дзякуй і ўсім нашым самадзейным артыстам ды іх адданым і ўдзячным гледачам!

**Марыя Памецька,**
**метадыст Цэнтра беларускай культуры, г. Даўгаўпілс**

РОДНЫЯ ЛЮДЗІ

# Экімань? У госці заглянь!

**Гурт "Купалінка" з даўгаўпілскага Цэнтра беларускай культуры паўдзельнічаў у інтэрактыўным тэатралізаваным свяце "Купалле" ў вёсцы Экімань Полацкага раёна**

Купалле гожа адзначалася 24 чэрвеня ў вёсцы Экімань Полацкага раёна, прычым — упершыню і незвычайна: у фармаце форум-тэатра. На беразе Дзвіны (яна ж уніз па цячэнні й называецца Даўгаваю…) у аграэкасядзібе "Якім і Маня" сабралася шмат гледачоў, што паступова сталі актыўнымі ўдзельнікамі свята. Паводле падання, Экімань сваю назву атрымала ад закаханых Якіма і Мані, якія жылі па розныя берагі рэчкі ды і перагукваліся. А сёння працавітыя, творчыя асобы Іван і Людміла пабудавалі на высокім беразе сядзібу. Дзеці выраслі, раз'ехаліся, а бацькі далі сядзібе імя з легенды і пашыраюць экаадпачынак. А краявід з вокнаў дома надзвычайны: рэчка, полацкі Сафійскі сабор, мост, агні горада…

Госці Купалля ў вёсцы Экімань паўдзельнічалі ў шэрагу абрадаў: збіралі гаючыя зёлкі ды кветкі, якія ў Купальскую ноч маюць асаблівую моц, вучыліся звіваць вянкі, вадзілі карагоды, гулялі ў народныя гульні, скакалі цераз вогнішча, варажылі на вадзе пры дапамозе вянкоў, шукалі Кветку шчасця. І было Купальскае вогнішча з колам у цэнтры, упрыгожаным вянкамі, кветкамі, стужкамі: сімвалізуе Сонца. А якая смачная была Купальская абрадавая ежа: сыр, кулага, верашчака, аладкі, квас і толькі што звараны на агні крупнік.

Асноўнае музычнае суправаджэнне свята было ўнікальным: фальклорны гурт "Варган" пад кожны абрад выконваў аўтэнтычныя архаічныя песні. Даўгаўпілскі гурт беларускай народнай песні "Купалінка" (кіраўнік Вячаслаў Пятроў) прадставіў латышскія песні, якія пяюць у дзень летняга сонцастаяння Ліга, і беларускія Купальскія песні. Госці свята змаглі прадэгуставаць традыцыйны пачастунак латышскага Ліга — Янаў сыр з кменам і аржаны хлеб з часнаком. Усе купальцы цёпла сустрэлі нашу "Купалінку" і падпявалі знаёмыя беларускія песні. Выдатным завяршэннем свята стала вогненнае шоу — яго зладзіў Тэатр гістарычнай рэканструкцыі "Полацкі звяз".



Купальскія кветкі

Як вядома, галоўны сэнс Купалля — адладжванне сувязі чалавека з Сусветам, ачышчэнне душы і цела ад усяго цёмнага, ад непатрэбных дзеянняў, ад злосці і няшчасцяў праз абрады. Тое і адбывалася ў аграсядзібе. Такая анімацыйная праграма прыадкрыла новыя турыстычныя магчымасці Экімані, якая зберагае і пашырае традыцыйную беларускую культуру.

Цэнтр беларускай культуры з Даўгаўпілса выказвае падзяку аддзелу адукацыі, спорту і турызму Полацкага райвыканкама за арганізацыю на высокім узроўні свята і нашай паездкі. Паклон наш і ўладальнікам аграэкасядзібы "Якім і Маня" за сардэчны прыём, а экскурсаводу Ларысе Яцкевіч — за пазнавальную экскурсію па Полацку.

**Ірына Якушонак,**
**Полацк—Даўгаўпілс**

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

# У Таджыкістане чытаюць пра Беларусь

**Кастусь Хадыка**

**Выйшаў нумар літаратурна-мастацкага часопіса "Памир", прысвечаны сучаснай беларускай літаратуры**

Старэйшы рускамоўны літаратурна-мастацкі часопіс "Памир" (выходзіць у Таджыкістане раз на квартал) прысвяціў другі сёлетні нумар сучаснай беларускай літаратуры. Ён адкрываецца рэдакцыйным артыкулам "У нас у гасцях — "Нёман". Змешчана вітальнае слова старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца. Цікава падаецца паэтычны раздзел часопіса. Знаёміцца з беларускай паэзіяй чытачы будуць па творах Міколы Мятліцкага, Анатоля Аўруціна, Елізаветы Палеес, Алеся Бадака, Міхася Башлакова, Навума Гальпяровіча, Валерыя Грышкаўца, Васіля Зуёнка, Казіміра Камейшы, Георгія Кісялёва, Васіля Макарэвіча, Юрыя Мацюшкі, Уладзіміра Мазго, Генадзя Пашкова, Міхася Пазнякова, Андрэя Скарынкіна.

Празаічную частку "беларускага сшытка" адкрывае Аляксандр Асіноўскі аповесцю "Партрэт хлопчыка на навальнічным фоне". Друкуецца ўрывак з аповесці Аляксандра Атрушкевіча "Тайна люстранога карпа". Змешчаны апавяданні Міхася Пазнякова, Алеся Жука, Алега Ждана, Кацярыны Карповіч, Ірыны Батаковай, Веры Зелянко. А ў раздзеле "Літаратуразнаўства" — артыкулы Ато Хамдама, Кірыла Ладуцькі. Асобна вылучана тэма "Таджыкская літаратура ў беларускім інтэрнэце".

Выпуск нумара — гэта плён руплівай працы рэдкалектыву часопіса "Памир" на чале з вядомым таджыкскім драматургам, кінасцэнарыстам, празаікам Джумой Куддусам. Велізарную работу правёў і пісьменнік, загадчык аддзела міжнародных сувязяў Саюза пісьменнікаў Таджыкістана Ато Хамдам. Ён, дарэчы, і член Саюза пісьменнікаў Беларусі. У нашай краіне выйшла на беларускай мове яго кніга "Подзвіг Эмамалі Рахмона" (напісана ў сааўтарстве з рускім літаратарам Таджыкістана Леанідам Чыгрыным, ураджэнцам Віцебшчыны). Ато Хамдам, часты госць у Беларусі, так гаворыць пра творчы праект: "Вельмі рады, што ў Таджыкістане чытачы будуць мець больш поўнае ўяўленне пра сучасную літаратуру Беларусі. Дарэчы, нядаўна мы выпусцілі адмысловы нумар газеты "Адабіёт ва саньят" ("Літаратура і мастацтва"), дзе на таджыкскай мове чытачу прапанавалі творы беларускіх пісьменнікаў".

А ў Беларусі, у Выдавецкім дом "Звязда" ідзе падрыхтоўка "таджыкскага выпуска" часопіса "Нёман". Расказвае яго галоўны рэдактар перакладчык Аляксей Чарота: "Таджыкская літаратура цікавая нам з розных пунктаў гледжання. І таму, што яе гісторыя складаецца з многіх стагоддзяў. І таму, што нам, нашаму чытачу карціць ведаць: што ў ёй адбываецца цяпер. Мінулі часіны Абдулькасіма Лахуці, Мірзо Турсун-Задэ, няма сярод жывых вялікага паэта Лаіка Шэралі, выдатнага празаіка Фацеха Ніязі. Так, жывуць іх творы. У тым ліку — і ў свядомасці чытачоў Беларусі. Але ж мастацкі працэс тым і цікавы, што не стаіць на месцы, развіваецца, ідзе наперад. Ведаю, плённа працуе сёння ў нацыянальнай паэзіі Таджыкістана спадарыня Фарзона. Яна ўганаравана званнем народнага паэта Таджыкістана. Шмат друкуецца вядомая яшчэ з савецкага часу Гулрухсор Сафіева. Недзе на пачатку 90-х напісала яна верш, прысвечаны Святлане Алексіевіч. Што чытач у гарах Паміра, ва ўсім Таджыкістане ўважліва ловіць кожнае слова паэта Саідалі Мамура. Што сярод таленавітай моладзі вылучаецца паэт, перакладчык, літаратуразнаўца Бахром Рахматаў. І, пэўна ж, у іх нямала палечнікаў. Іх творчасці мы і прысвецім адмысловы нумар часопіса "Нёман".

У традыцыях Выдавецкага дома "Звязда" — развіццё міжнародных сувязяў беларускай літаратуры. І ўвага да таджыкскай літаратуры займае тут важнае месца.

**Ад рэдакцыі.** Як паведаміў Аляксей Чарота, "таджыкскі выпуск" часопіса "Нёман" цяпер — у стадыі вёрсткі. Дарэчы, па ініцыятыве нашай рэдакцыі былі ўзяты ў работу і матэрыялы пра беларуса Андрэя Запольскага, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, аднаго з першых будаўнікоў таджыкістанскага горада Чкалаўска (першынец атамнай прамысловасці СССР, у 2016-м перайменаваны ў Бустон). Будуць у часопісе і вершы ягонай унучкі Людмілы Запольскай, якая памятае пра свае беларускія радавыя карані, жыве ў Бустоне і працуе актрысай у Рускім драмтэатры імя А. С. Пушкіна.




Вокладка выдання

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Святло з далёкай даўніны

## Актывісты Беларускай грамады Малдовы адзначалі Купалле ўжо ў трэці раз

Купалле мы ладзім разам з актывістамі Рускай абшчыны Малдовы. Хоць у Расіі свята язычніцае называюць "День Ивана Купала", аднак глыбінныя карані яго, як вядома, у братніх народаў агульныя. У рускамоўнай частцы інтэрнэта знаходзім: "День Ивана Купала — изначально языческий праздник, посвященный Солнцу и славянскому божеству Купале". Між тым рускія адзначаюць Дзень Івана Купала заўсёды толькі 7 ліпеня: хоць свята і язычніцкае, фактычна ж яно там ладзіцца па праваслаўным календары, зраслося з ушанаваннем дня Раства Іаана Хрысціцеля. А вось беларуская традыцыя падзяляе свята на Купалле і на Дзень святога Яна, таму і ў песнях народных спяваецца: "Сёння Купала, а заўтра — Ян". Песню з такой назвай запісаў у 1980 годзе і знакаміты ансамбль "Песняры", яе можна знайсці ў нэце.



Купалле ў Малдове мае яскравы беларускі каларыт

Раней, сцвярджаюць спецыялісты, нашы продкі адзначалі Купалле "па Сонцы": у пару, калі яно, дасягнуўшы ў гадавым ходзе найвышэйшае моцы, пачынае "згасаць". У наш час астранамічна, без усялякіх скажэнняў, Купалле варта было б усім адзначаць у ноч з 25 на 26 чэрвеня. Але ж ёсць розныя календары, уплывы хрысціянскіх ды мясцовых традыцый, часам арганізатары свядома ладзяць свята ў бліжэйшыя выхадныя… Хоць, калі разабрацца, Свята Купалле, маючы глыбокі духоўны сэнс і даўнія традыцыі, відавочна магло б стаць для беларусаў і своеасаблівым Днём яднання, нашым агульнанацыянальным святочным, выхадным днём. А ў сённяшняй сітуацыі варта, падаецца мне, і "не цыкліцца" на канкрэтных датах, гаварыць пра Купальскую пару, паважаючы розныя меркаванні. Галоўнае, аднак, зберагаць ад спусташэння духоўную першаснову Свята, не пераўтвараючы яго ў бяздумнае, забаўнае гульбішча.

Па вёсках раней на Купалле, як праца па гаспадарцы пароблена, людзі ішлі да рэчак, азёр. Бо купанне ў гэтую пару, лічылася, "змывае" з чалавека як фізічныя, так і душэўныя хваробы. А як не было паблізу вадаёмаў, то



Купальскія вобразы

ішлі ў лазню. А дзяўчаты рыхтаваліся ў чароўную Купальскую ноч зазірнуць у будучыню: кажуць, гэта лепшы час для варожбаў і любоўнай магіі. Найчасцей варажылі "на вянку", які сімвалізаваў само жыццё яго стваральніцы. Запальвалі свечкі ды ўстаўлялі іх у вянок (часам на драўляны кружок), пасля чаго апускалі ў раку (плынь часу?). Калі вянок не патануў і свечка не згасла, то верылі: сёлета дзяўчына абавязкова выйдзе замуж. Калі ж тануў ці сплыў далёка, то казалі: не быць ёй нявестай. Яшчэ варажба: каб даведацца адказ на пытанне, якое цікавіць, дзяўчаты задавалі яго прама перад рытуальным вогнішчам. І ўважліва сачылі за полымем. Калі яно роўнае, спакойнае і яркае, то жаданне спраўдзіцца, калі перарывістае, неспакойнае — не. Такія варожбы, падаецца мне, прывучвалі людзей быць назіральнымі, суадносіць свае мары, жаданні з дыханнем Сусвету, віраваннем ягоных нябачных плыняў.

Купалле — дзівоснае, непаўторнае свята. Беларуская грамада Малдовы сумесна з Рускай абшчынай ужо трэці год адзначала яго: бо не забываем свае карані, сваю духоўную спадчыну ды імкнемся перадаць тое, што самі ведаем, маладзейшым. Сёлета мы адзначалі Купалле 9 ліпеня на беразе Днястра ў курортным пасёлку Вадул луй Водэ. Прыемна, што ў свяце паўдзельнічалі прадстаўнікі пасольстваў Беларусі ды Расіі, Расійскага цэнтра навукі ды культуры, мясцовых уладаў, многія госці.

Спачатку мы, абвясціўшы пачатак свята, расказалі крыху пра гісторыю, традыцыі Купалля. Потым быў выезд на конях Купальскіх персанажаў: язычніцкіх багоў Сонца і Купалы. Іх світа са сцягамі йшла побач, усе з цікавасцю і радасцю іх віталі. Потым пачаліся Купальскія гульні, конкурсы, прайшла Купальская віктарына (то былі пытанні пра народныя звычаі, прыкметы, травы), конкурс волатаў (перацягванне ліны). Далей — звіванне вянкоў, распальванне Купальскага вогнішча. Пераможцы і большасць удзельнікаў атрымалі призы. Хараша гучалі на ўзбярэжжы Днястра беларускія, рускія і ўкраінскія песні — гэта стараліся наш вакальны гурт "Зораньки", хор вёскі Нова-Траецкае і хор Рускай абшчыны. Потым, калі рытуальнае вогнішча дастаткова прагарэла, пары скакалі цераз яго і акуналіся ў раку: то было ачышчэнне агнём і вадою. Хтосьці з малодых да таго ж пайшоў у лес шукаць Папараць-кветку...

Толькі позна ўвечары ўсе мы, задаволеныя і трохі стомленыя, разыходзіліся з нашага Купалля. Хараша было на душы — бо зрабілі нешта прыгожае, добрае. А далёка па Днястры плылі нашы Купальскія вяночкі: як сімвал нашай вернасці народным традыцыям, духоўнай далучанасці да Сусвету бацькоў і дзядоў, а таксама сімвалы дружбы паміж народамі, любові, павагі людзей адзін да аднаго.

**Юры Статкевіч,**
**старшыня Беларускай грамады ў Малдове**

---

СПАДЧЫНА

# Добрая музыка не старэе

**Янка Яцкавец**

**Творчы калектыў "Беларуская Капэла", які працуе пры Вялікім тэатры, сёлета адзначае 25-годдзе**

У самой назве творчай суполкі чуецца рэха з мінулага, калі капэлаю называлі калектыў, у складзе якога — музыканты (аркестр і салісты), спевакі (хор і салісты) і артысты балета. На сайце Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі можна пачытаць пра цікавыя праекты капэлы. Даведацца: за прыклад узятыя капэлы беларускай магнатэрыі XVIII стагоддзя. Найбуйнейшыя з іх, сцвярджаюць знаўцы, былі й культурнымі цэнтрамі еўрапейскага ўзроўню: Нясвіжская ў князёў Радзівілаў, Слонімская ў князя Міхала Казіміра Агінскага, Гродзенская ў графа Антонія Тызенгаўза, Ружанская ў князёў Сапегаў. Прыкладам для пераймання сталі й замежныя, у тым ліку сучасныя аналагі, сярод якіх Лейпцыгскае "Бахаўскае таварыства", Зальцбургскі "Моцартэум", Кёльнскі "Фонд Ёзафа Гайдна".

Стварыў "Беларускую Капэлу" ў 1992 годзе і па гэты час нязменна кіруе ёю Віктар Скарабагатаў — вядомы оперны спявак (лірычны барытон), лаўрэат Дзяржпрэміі, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Сама ж капэла "арганізуе і ажыццяўляе мастацкае кіраўніцтва музычнымі фэстамі, гэта навукова-даследчы цэнтр па вывучэнні беларускай музычнай спадчыны, а таксама рэдактарскі калектыў, у якім рыхтуюцца да выдання ноты адпаведнай тэматычнай скіраванасці".

Юбілею прысвячаўся Вечар фартэпіяннай музыкі Беларусі XVIII-XX стагоддзяў у Камернай зале Вялікага тэатра. Іграў народны артыст Беларусі прафесар Ігар Алоўнікаў. "За чвэрць стагоддзя мы шмат зрабілі, — расказаў маэстра журналістам. — Удалося адшукаць і падняць велізарныя пласты беларускай музыкі розных гадоў: фартэпіяннай, вакальнай, опернай, інструментальнай. Цяпер мы можам сапраўды атрымліваць асалоду ад цудоўнай музыкі беларускіх аўтараў, пра якую раней ніхто й не ведаў". Канцэрт, прысвечаны беларускай фартэпіяннай музыцы, ахапіў тры стагоддзі.

---

СЯБРЫ БЕЛАРУСІ

# Важкая прафесарская падтрымка

**Адам Мальдзіс**

**Да стварэння Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў непасрэднае дачыненне мела і першы амбасадар Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь (1992) Эльжбета Смулкова**

Сёлета — 25 гадоў Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў і 85 — прафесару з Польшчы Эльжбеце Смулковай. Нядаўна ў Мінску прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі" ў гонар прафесара Эльжбеты Смулковай". Як вядома, на пачатку 90-х пані Эльжбета працягнула руку дапамогі Беларусі. Вясной 1990-га навуковыя дэлегацыі з Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны сабраліся ў Ватыкане, каб абмеркаваць мірныя шляхі вырашэння дыскусійных гістарычна-культурных пытанняў. Выступаць на сустрэчы з Папам рымскім Янам Паўлам ІІ беларускія калегі даручылі мне. У прыватнасці, я гаварыў: калі на беларускія землі прыязджаюць ксяндзы з Польшчы, то набажэнствы яны адпраўляюць толькі на польскай мове, а парафіян адразу ж абвяшчаюць палякамі. На гэта Папа супакойваюча адказаў: тут вяртанне да беларускасці павінна адбывацца паступова. І раптам мяне падтрымала прафесар Варшаўскага ўніверсітэта Эльжбета Смулкова. Яе рашаючая фраза: "Ойча святы, калі нехта з місіянераў едзе да папуасаў, то найперш вывучае папуаскую мову..." Вынікі фразы, падаецца мне, мы адчуваем і сёння ва ўсёй Беларусі, асабліва ў Мінска-Магілёўскай каталіцкай архідыяцэзіі, якой сёлета таксама 25 год. Беларуская мова паўнавартасна гучыць у касцёлах.

Прафесар Эльжбета Смулкова, тады аўтар чатырох кніг па беларускіх мове і гаворках, летам 1990-га сабрала ў Беластоку міжнародную нараду, якая сфарміравала аргкамітэт па правядзенні першага Форуму беларусістаў. Кангрэс адбыўся ў 92-м: аб'ядналіся філолагі, гісторыкі, мастацтвазнаўцы прыкладна з двух дзясяткаў краін. І хоць змянілася, абнавілася Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, але ж у ёй памятаюць дабрадзейку. Таму беларуская частка МАБ і арганізавала канферэнцыю ў гонар Эльжбеты Смулковай. Сама яна не змагла прыехаць, была ў Мінску польская беларусазнаўчая эліта на чале з Міхалам Саевічам.



Эльжбета Смулкова

Удзельнікаў канферэнцыі віталі кіраўнікі БДУ і філфака універсітэта, дзе праходзіла сустрэча, Пасол Польшчы ў Беларусі Конрад Паўлік і кіраўнік Польскага інстытута ў Мінску Томаш Адамскі.

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10ª, 220013, Мінск

**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005

**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11

**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31

**E—mail:** golas_radzimy@tut.by

**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.

**Тыраж:** 1920, **Заказ:** 1047

**Час падпісання ў друк:** 20.10

Выходзіць 1 раз на тыдзень

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.

© "Голас Радзімы", 2016